Фралоў П.

# СКРОЗЬ ВАРОЖАЕ КАЛЬЦО

**Рудкін Піліп Мікітавіч нарадзіўся ў 1893 годзе на Мсціслаўшчыне ў вёсцы Чорная Сасна ў сям'і селяніна. Служыў у царскай арміі. Пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі стаў чырвонагвардзейцам. Актыўна ўдзельнічаў у Грамадзянскай вайне. Вучыўся на камандных курсах. У начатку Вялікай Айчыннай вайны камандаваў асобнай танкавай брыгадай.**

**Званне Героя Савецкага Саюза палкоўніку П. М. Рудкіну прысвоена Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 31 сакавіка 1943 года.**

Гэта было ў пачатку 1943 года. У дні жорсткіх баёў за Харкаў. Жадаючы ў што б там ні стала ўтрымаць важны стратэгічны пункт і чыгуначны вузел, фашысты кінулі ў контрнаступленне супраць войск Паўднёва-Заходняга фронта буйныя танкавыя групоўкі, адборную пяхоту.

Войскі Паўднёва-Заходняга фронта, якія выйшлі на падступы да Дняпрапятроўска, вымушаны былі часова адступіць. Пасля гэтага асноўныя танкавыя сілы ворага абрушыліся на часці нашай 3-й танкавай арміі, якая абараняла Харкаў з поўдня.

І днём і ноччу не змаўкала кананада бою. На рубяжы Таранаўка-Зміеў, перакрываючы чыгунку Харкаў-Лазавая, абаранялася 25-я гвардзейская стралковая дывізія, з часцямі якой дзейнічала 179-я асобная танкавая брыгада пад камандаваннем палкоўніка Піліпа Мікітавіча Рудкіна.

Шэсць сутак трымалі яны свой рубеж. Па некалькі разоў у дзень нашы танкі кідаліся ў контратакі, агнём і гусініцамі знішчаючы ворага. Да чырвані раскаляліся ствалы гармат. Здавалася, метал не вытрымае напружання бою. А людзі вытрымлівалі. І камандзір брыгады ў каторы ўжо раз сарваным у грохаце баёў голасам аддаваў па рацыі каманду:

– Падрыхтавацца да контратакі!

І зноў, узнімаючы фантаны бруду ў раскіслым веснавым украінскім чарназёме, імчалі насустрач ворагу сталёвыя крэпасці. І зноў на самых цяжкіх участках бою, дзе, здавалася, вось-вось не вытрымаюць людзі, нібы з-пад зямлі вырастала машына камбрыга, і падбадзёраныя танкісты з падвоенай ярасцю кідаліся на ворага.

37 танкаў і самаходных гармат пакінулі фашысты на полі бою, згубілі да двух батальёнаў пяхоты, але прайсці праз Таранаўку да Харкава так і не змаглі. Тады гітлераўцы абыйшлі горад з поўначы. 14 сакавіка яны авалодалі Чугуевым і акружылі войскі 3-й танкавай арміі. Танкісты атрымалі загад выходзіць з кальца.

Палкоўнік Рудкін узначаліў прарыў з акружэння не толькі танкавых падраздзяленняў, але і часцей 17-й брыгады НКУС, байцоў 19 стралковай дывізіі.

Шлях выхаду з кальца ляжаў праз сядзібу саўгаса імя Фрунзе. Разведка данесла, што ў гэтым населеным пункце скапіліся значныя сілы танкаў і пяхоты ворага.

– Можа абыдзем, – прапаноўвалі некаторыя.

Але палкоўнік Рудкін не падтрымаў іх. У ноч на 16 сакавіка ён сабраў камандзіраў выходзячых з акружэння часцей і растлумачыў становішча:

– Нам давядзецца прарывацца праз саўгас. Іншага шляху для танкаў няма. Некалі нам і ўдакладняць, якія сілы ворага знаходзяцца ў населеным пункце. Раптоўнасць удару – зараз галоўнае. Дзейнічаць трэба смела, рашуча, не даючы фашыстам апамятацца...

Пасля поўначы, пад прыкрыццём цемнаты, танкісты і пяхота ўварваліся на сядзібу саўгаса. У вокны дамоў паляцелі ручныя гранаты. Нямецкія танкісты не паспелі нават заняць месцы ў машынах.

У кароткім, але жорсткім баі фашысты згубілі 16 танкаў, 12 бронетранспарцёраў, 2 шасціствольныя мінамёты, 60 аўтамашын, сотні салдат.

Удар быў настолькі раптоўным і імклівым, што разгубленыя гітлераўцы так і не змаглі арганізаваць праследванне нашых часцей. Раніцай 16 сакавіка палкоўнік Рудкін вывеў з варожага кальца танкі сваёй брыгады і 2500 байцоў пяхотных падраздзяленняў.

За гэты подзвіг Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР Указам ад 31 сакавіка 1943 года прысвоіў Піліпу Мікітавічу званне Героя Савецкага Саюза.

Вайну ён закончыў генералам і выхаваў яшчэ многа мужных, умелых майстроў танкавага бою.

**Фралоў, П. Скрозь варожае кальцо / П. Фралоў // Святло Кастрычніка (Мсціслаў). — 1983. — 7 мая. — С. 2.**